# ЯДНАЕ СЛОВА

Украінская літаратура з'яўляецца адным з самых актыўных атрадаў шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Верная ленінскім прынцыпам партыйнасці і народнасці, жыццесцвярджальнаму метаду сацыялістычнага рэалізму, яна сваімі лепшымі творамі нясе да мільёнаў людзей ідэі марксізму-ленінізму, выхоўвае любоў да сваёй Айчыны, умацоўвае дружбу народаў СССР.

Да паслуг беларускіх чытачоў у бібліятэках нашай рэспублікі — вялікая колькасць кніг украінскіх аўтараў. Напрыклад, толькі ў фондах Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна цяпер налічваецца 44.731 выданне на ўкраінскай мове, акрамя таго, шмат твораў пісьменнікаў брацкай рэспублікі, якія выйшлі ў перакладзе на рускую і беларускую мовы.

З кожным годам расце цікавасць беларускіх чытачоў да ўкраінскай літаратуры. Асабліва гэта заўважаецца цяпер, калі ў рэспубліцы праходзяць Дні літаратуры і мастацтва Украінскай ССР.

Напярэдадні гэтай знамянальнай падзеі ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна адкрылася кніжная выстаўка. У сямі яе раздзелах прадстаўлены шматлікія выданні, якія даюць наведвальнікам уяўленне пра развіццё ўкраінскай літаратуры, тэатра, музыкі, кіно, выяўленчага мастацтва.

На стэндах змешчаны творы вядомых украінскіх паэтаў і пісьменнікаў Максіма Рыльскага, Андрэя Малышкі, Міколы Бажана, Міколы Нагнібеды, Платона Вараньно, Алеся Ганчара, Міхайлы Стэльмаха, а таксама кнігі маладых літаратараў.

Доўга затрымліваюцца наведвальнікі каля рэпрадукцый з карцін мастакоў брацкай рэспублікі.

Аматары кіно, тэатра, музыкі знаёмяцца са спецыяльнымі выданнямі, якія расказваюць пра развіццё гэтых галін мастацтва на Украіне.

Падыходжу да юнака, які трымае ў руках кнігу вершаў і паэм «Зялёны вінаграднік» Віталя Кароціча, што нядаўна выйшла ў Маскве ў перакладзе на рускую мову. Гэта студэнт V курса філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Вадзім Баршчэўскі. Ён гаворыць:

— Хоць у нас гарачая пара — падрыхтоўка да абароны дыпломных работ, але выбраў вольную хвіліну і прыйшоў з чытальнай залы сюды — на выстаўку. Украінскай літаратурай зацікавіўся я даўно. Яшчэ са школьных гадоў захапляўся вершамі вялікага кабзара Тараса Шаўчэнкі, Лесі Украінкі. З сучасных украінскіх пісьменнікаў хачу выдзеліць Міхайлу Стэльмаха і Віталя Кароціча. Проза Стэльмаха прываблівае настраёвасцю, лірычнасцю і, разам з тым, праўдзівым паказам жыцця.

Цікавыя, незвычайныя па форме вершы і паэмы Віталя Кароціча. Лепшыя рысы яго паэзіі — гэта грамадзянскасць, пачуццё адзінства вялікай сям'і савецкіх народаў, смеласць паэтычных вобразаў.

Абавязкова паслухаю выступленні ўкраінскіх пісьменнікаў. Шчыра жадаю ім цікавых радасных сустрэч на гасціннай беларускай зямлі.

Студэнтка III курса Мінскага інстытута культуры Аліна Лісеўская — будучы дырыжор хору. І таму яе цікавяць выданні, прысвечаныя музычнаму мастацтву. Аліна расказвае:

— Я прагледзела кнігі «Праблемы ўкраінскай савецкай музыкі», «Спявае Букавіна», «Украінская музычная Ленініяна», «Мелодыі абноўленага краю» і знайшла ў іх шмат чаго для сябе цікавага і карыснага.

Вельмі люблю ўкраінскую літаратуру і мастацтва і таму шчыра радуюся прыезду ў нашу рэспубліку вядомых пісьменнікаў, артыстаў Украіны. З цікавасцю праслухала канцэрт Дзяржаўнага заслужанага акадэмічнага ўкраінскага народнага хору імя Р. Вяроўкі. Нельга перадаць словамі захапленне цудоўным выкананнем артыстамі народных песень. За час Дзён літаратуры і мастацтва Украінскай ССР пастараюся пабываць яшчэ на некалькіх канцэртах гасцей, на літаратурных сустрэчах.

Вялікая цікавасць у гэтыя дні наведвальнікаў бібліятэкі да творчасці ўкраінскіх літаратараў сведчыць аб тым, што іх натхнёнае слова кранае сэрцы беларускіх чытачоў, абуджае ў іх светлыя пачуцці братэрства і дружбы.

**С. ЗАКОННІКАЎ.**